# БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ
ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

№ 33 (80)
снежань
2008 г.

Выдаецца
з мая 2006 г.

## Калодзеж

с.3

## Настаўнікі

с.4

# Дарога

с.2

КАМПУКАТ.org

# ДАРОГА

Назіраючы за тым, што адбываецца ў гэтыя дні паміж брылеўскімі вуліцамі Першамайская, Кастрычніцкая і Палявая, можна з упэўненасцю прыгадаць народную мудрасць: ***кропля камень точыць.*** Урэшце рэшт шматлікія звароты мясцовых жыхароў у розныя кіруючыя інстанцыі, публікацыі ў "Брылеўскім летапісу" (памятаеце комікс "Эх, дарогі!", дзе з дапамогай конскай сілы цягнулі з гразі аўтамабіль?), станоўчыя адносіны да гэтага пытання былога старшыні Магілёўскага райвыканкама, а зараз дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А.І.Разганава паспрыялі таму, што на сумнавядомай "дарозе жыцця" з'явілася дарожная тэхніка і работа закіпела. Трэба дадаць, што 17 снежня тут пабываў памочнік Прэзідэнта, галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь Міхайлавіч Лаўранкоў, і менавіта гэты дзень быў адзначаны надзвычай ударнай працай дарожнікаў.

Хочацца спадзявацца, што ў мінулае адыходзяць сапраўдныя жахі, калі прыходзілася несці хворых да асфальтаванай Першамайскай альбо сустракаць "Хуткую дапамогу" з гумавымі ботамі ў руках -- каб доктар змог дабрацца да месца прызначэння. Усё-ткі дваццаць першае стагоддзе за вокнамі. І людзі павінны жыць па-людску.

***Мікола ЯЦКОЎ.***

**Так было...** *1 сакавіка 2008 г.*

**Так зараз...** *18 снежня 2008 г.*

# "Калодзеж, калодзеж, дай вады напіцца!.."

Гэты калодзеж на вуліцы Кастрычніцкай у Брылях зрабіўся, можна сказаць, легендарным. Ён вытрываў, калі аднойчы на яго наехаў трактар, але з цягам часу пачаў адчуваць вынікі таго сутыкнення -- кольцы скрануліся з месцаў і на ўзроўні зямлі з'явілася значная шчыліна, куды трапляў ўсялякі бруд. Вяскоўцы неаднаразова звярталіся за дапамогай ў сельсавет, але, як сказала мясцовая жыхарка Тамара Іванаўна Смалякова, больш за сем год справа з месца так і не скранулася. І толькі калі гэта праблема была агучана на перадвыбарчай сустрэчы з Аляксандрам Іванавічам Разганавым, то адразу усё памянялася: з'явілася фінансаванне, брыгада прыезджых спецыялістаў вычысціла дно калодзежа і ўсё падправіла, а з брылеўцамі Сяргеем Васільевічам Смаляковым і Анатолем Аляксеевічам Булаўскім была заключана дамова на рамонт драўлянага калодзежнага "адзення". І ўжо сёння можна з задавальненнем бачыць вынікі гэтай работы.

*Ала ЯЦКОВА,*
*дэпутат Брылеўскага сельскага Савета.*

Так было... 1 сакавіка 2008 г.

С.В.Смалякоў

Новае аблічча калодзежа

А.А.Булаўскі

Фотаздымкі Міколы Яцкова

Дэпутат Брылеўскага сельскага Савета А.М.Яцкова, С.В.Смалякоў і Т.І.Смалякова. 13 снежня 2008 г.

# За вопытам - у Брылі

16 снежня 2008 года ў Брылеўскай пачатковай школе адбылося паседжанне раённага метадычнага аб'яднання настаўнікаў пачатковых класаў. Дваццаць восем настаўнікаў 2-х класаў раёна прыехалі да нас, каб навучыцца майстэрству выкладання матэматыкі.

Вельмі цікавы ўрок падрыхтавала настаўніца 2 класа І.Ф.Пракопчык. У госці да дзяцей прыходзіў Снегавік, які прыносіў розныя цікавыя матэматычныя заданні, якія вучні з задавальненнем выконвалі. Урок быў карысным не толькі для дзяцей, але і для гасцей, якія тут прысутнічалі. Іна Фёдараўна працуе настаўніцай усяго другі год, але яе ўрок атрымаў высокую ацэнку ў педагогаў раёна.

*Т.Ф.Прудзікава, І.Ф.Пракопчык і Снегавік.*

З майстэрствам работы па выкарыстоўванню эфектыўных метадаў рашэння састаўных задач пазнаёміла прысутных настаўніца 4 класа Тамара Фёдараўна Прудзікава. Яна не першы год дае адкрытыя ўрокі для педагогаў раёна. Ёсць чаму павучыцца ў гэтай абаяльнай, вопытнай і таленавітай настаўніцы. Таму і даручаюць ёй праводзіць урокі па знаёмству маладых педагогаў з узорамі перадавой педагагічнай практыкі.

Мы вельмі рады, што маем гонар праводзіць паказальныя ўрокі ў нашай школе.

***Тамара ЖУРАЎКОВА, настаўніца.***

**Фота М.Яцкова.**

# Месца сустрэчы

*Марыя Шыманоўская, Вадзім Сідараў, Вячаслаў Меляшкоў і Арцём Гулакоў разам з Алай Міхайлаўнай Яцковай.*



*Надзея Журава ў кніжным казачным сусвеце.*

Брылеўская сельская бібліятэка прапануе сваім наведвальнікам не толькі багаты выбар рознастайнай літаратуры, але і магчымасць з цікавасцю бавіць вольны час. Гэтым часта карыстаюцца вяскоўцы, асабліва школьнікі, якія знаходзяць сабе занятак для душы ў выглядзе цікавых гульняў ці прагляду свежых нумароў папулярных часопісаў. Але самае галоўнае тут - магчымасць па - сяброўску сустрэцца, пагаманіць, абмеркаваць нешта надзённае. І гэта вельмі важна як для іх, так і для бібліятэкі, бо для таго яна і існуе -- быць цёплым і ўтульным месцам сустрэчы для усіх, хто імкнецца да святла культуры і духоўнасці.

***М. Я.***

# Сваімі рукамі

Школьнікі, якія займаюцца ў гуртках Брылеўскага сельскага Дома культуры, маюць магчымасць сваімі рукамі ствараць прыгажосць. І тут няма розніцы -- ці то музыка і танцы, ці то тэатральная сцэнка, ці то прыкладное мастацтва у выглядзе вырабаў з бісеру і нават са звычайнай паперы. Галоўнае і важнае -- адчуць сябе творцам -- калі летуценнасць думкі ператвараецца ў нешта рэальна - матэрыяльнае, якое можна пабачыць на свае вочы, патрымаць у руках і -- здзівіцца гэтаму цуду. Усе мы -- цудатворцы...

***Вольга Майбурава,***
*настаўніца.*

**Карына Паршнёва, Аляксей Паршнёў, Вольга Мікалаеўна Майбурава, Яна Какоўка, Надзея Журава.** *27 лістапада 2008 г.*

**Дом Бабы-Ягі.** *Аўтар -- Аляксей Паршнёў.*

**Дом Бабы-Ягі.** *Аўтар -- Яна Какоўка*

**Дом Зайкі.** *Аўтар -- Карына Паршнёва*

*-- А можа, зробім так?..*

**Дом Папялушкі.** *Аўтар -- Яна Какоўка*

**Надзея Журава і Яна Какоўка сваімі рукамі робяць прыгожыя святочныя паштоўкі.** *2 лістапада 2008 г.*

**Фота Міколы Яцкова**

**Дом Дзюймовачкі.** *Аўтар -- Надзея Журава.*

КАМПІКТ-ТОРГ

## Літаратурная старонка

# Кожны чалавек - СОНЦА

*Не так даўно ў Магілёве пабачыў свет паэтычны зборнік "Кожны чалавек -- сонца". Яго аўтарамі з'яўляюцца сябры клуба "Творчая гасцёўня" Дома дзіцячай і юнацкай творчасці "Эверэст" Кастрычніцкага раёна горада Магілёва. Вялікую работу па рэдагаванню зборніка зрабіла бібліятэкар Брылеўскай сельскай бібліятэкі Ала Яцкова, а прадмову напісаў Мікола Яцкоў. Прапануем вашай ўвазе гэта ўступнае слова, а таксама некалькі вершаў са зборніка.*

Паэзія!.. Ніхто не ведае – што гэта такое. Сапраўдныя вершы не выдумляюцца – яны прыходзяць самі. Адкуль – невядома. І ёсць абраннікі, якім дадзена чуць гэтыя меладычныя згукі.

Хто яны – гэтыя абраннікі? Чаму менавіта яны? Невядома. Але яны ёсць – з нечым *такім* у вачах, што адразу разумееш: з гэтым чалавекам размаўляе Неба. І ад гэтай існасці нікуды не дзецца, бо заўсёды побач з намі жылі, жывуць і будуць жыць *Божыя* людзі, прарокі, праз якіх сваё Слова кажа Ўсявышні.

І развінаецца перад намі саматканы абрус нечаканых слоў, вобразаў, параўнанняў, аздобленых мелодыкай рыфм і матэматыкай рытмаў. І гэтая відавочная эфемернасць чамусьці дапамагае нам жыць і *людзьмі звацца*.

Таму вельмі прыемна, што і ў нашай старонцы сабраліся такія незвычайныя людзі пад высокім дахам паэтычнага зборніка *"Кожны чалавек – сонца"*. Яны самыя розныя – і па ўзросту, і па жыццёвых набытках, і па памкненнях. Але аб'ядноўвае іх адно: адрываючыся раз-пораз ад грэшнай зямлі, узлятаюць яны лёгкакрылы ў паднебную прастору, дзе і існуе тое невядомае, што называецца *паэзіяй*.

А мы не будзем аналізаваць, як гэта ў іх атрымліваецца, -- мы проста будзем іх зачаравана слухаць, наталяючы кождзённую жыццёвую смагу крынічнай вадой узнёсласці, непаўторнасці і сонечнасці.

*Мікола ЯЦКОЎ,*
*член Саюза беларускіх пісьменнікаў.*

**Дзяніс СІДАРОК**

***Роднае слова.***

*Дзякую вуснам сваім за тое,*
*Што з іх нараджаецца роднае слова.*
*Такое дзіўнае і дарагое,*
*Такое глыбокае, быццам мора.*
*Няма прыгажэй беларускае мовы,*
*Мовы народнай і мовы святой,*
*Бы дождж залаты, яе мілыя словы*
*Заўсёды яны ўзнімаюць настрой.*
*Слова – пралеска, слова – ручай,*
*Слова – анёлавы чысты смех,*
*Мой беларускі любімы край*
*Блакітна-белы, зусім як снег.*

**Андрей КАВУН**

***Лето в деревне.***

*Хорошо в деревне летом!*
*В той стороночке родной*
*Пахнет хлебом, свежим сеном*
*И покошенной травой.*
*Как-то утром спозаранку,*
*И пока блестит роса,*
*Вышел я косить делянку:*
*«Слышишь, как поёт коса?»*
*И разносится повсюду,*
*Словно жаворонка трель,*
*Звон косы... Я не забуду*
*Этой музыки полей*

**Жана ЖУРАЎЛЁВА**

***Шчасце.***

*Шчасце – васілёк сіні,*
*Што ўлетку на полі грае.*
*Шчасце – бліскучы іней*
*На прасторах роднага краю.*
*Шчасце – лён блакітны,*
*Што цвіце у шырокім полі.*
*Шчасце – далягляд аксамітны...*
*Я іншай не жадаю долі.*

# Брылеўская бібліятэка інфармуе...

Планета-семья

№ 6, 2008 г.

Поэтесса Нина СУПРУНЕНКО находит неповторимую поэтическую интонацию, говоря о своей дочери:

* * *

*Расплескались волосы*
*Жёлтою волной!*
*Дочка моя, солнышко,*
*Лучик золотой!*
*Как хочу я, ласточка,*
*Заслонить тебя*
*От судьбы неласковой,*
*Трепетно любя...*
*Как хочу неистово*
*Защитить от бед,*
*Как желаю искренне*
*Только добрых лет!*
*Дочка моя, доченька.*
*Лучик дорогой,*
*Утро, день и ноченька --*
*Всё тебе одной!*

Народная газета

## Навошта маладзику манеты паказваць

**МАНЕТЫ** (медныя, залатыя, срэбныя) заўсёды сімвалізавалі дабрабыт, прыбытак, поспех і часта выкарыстоўваліся ў абрадах сямейнай накіраванасці:

► У купель для першага рытуальнага купання клалі срэбную ці залатую манету, каб дзіця было здаровае і яму спрыяў поспех.

► Для таго ж маладым падчас вянчання ў храме раілі класці пад пяту манету -- медныя пятакі.

► Дрэннай прыкметай на пахаванні было тое, калі памерлы адкрываў вочы. Лічылася, што ён выглядае яшчэ кагосьці. У такіх выпадках на вочы памерламу клалі манеты, якія потым трэба было абавязкова кінуць у магілу.

► Манеты кідалі ў магілу і сваякі да трэцяй ступені сваяцтва. Тым самым яны "выкуплялі" пераправу сваяку на той свет.

► Знойдзеная манета прадказвала змены, павелічэнне дастатку -- калі ляжала "арлом" уверх, няўдачы -- калі ляжала "рэшкай" уверх.

► Калі сярод іншых манет траплялася манета са шчарбінай, гнутая манета, то гэта заўсёды прадказвала прыбытак. Таму яе адкладвалі ўбок ці насілі ў кашальку як талісман, сімвал поспеху. Тое ж самае тычылася манеты з дзірачкай.

► Каб заўсёды быць з прыбыткам, неабходна манету паказваць маладому месяцу, які вы ўбачылі справа ад сябе.

МВ Магілёўскія ведамасці

20.12.2008 г.

## ЛОВУШКИ ДЛЯ ПОКУПАТЕЛЕЙ

"Если у человека есть деньги, его всегда можно раскрутить на покупку!" -- сказала сотрудница отдела маркетинга одной успешной могилёвской фирмы. И рассказала о некоторых профессиональных "ловушках" для покупателей:

- При ходьбе человек всегда забирает немного влево, поэтому почти у всех крупных супермаркетов вход в торговый зал расположен справа, а кассы -- слева.
- На полки на уровне человеческого взгляда (с их покупают чаще всего) ставят самые ходовые, но не самые дешёвые товары. То, что подешевле, расставляют на самых нижних полках.
- Товары одного назначения выставляются на полке по мере возрастания их цены слева направо. Так больше шансов, что покупатель возьмёт самый дорогой стиральный порошок, стоящий самым последним в ряду. Ведь именно на нём взгляд посетителя задержится дольше всего.

Аргументы и факты

№ 49, 2008 г.

*Народный артист СССР Олег БАСИЛАШВИЛИ размышляет о том, что волнует:*



Олег Басилашвили

"...У многих российских граждан в генах заложено рабское понимание мира. Ещё начиная с эпохи древлян народ делился на князей и смердов, господ и рабов. В момент революции народ был свободен, а затем его опять закабалили. Я помню время правления Сталина. У колхозника отбирали паспорт, и он не имел права покинуть деревню. В городе такого беглеца милиция могла тут же арестовать. Это было точно такое же крепостное право, как в XVIII или XIX веках. Люди работали не на себя, а на государство за галочку, и жили только за счёт своих шести соток. Крестьян отучили быть хозяевами своей жизни, своей земли, своей судьбы."

Зірка і людзі

♥ Каждый палец человека за время жизни сгибается примерно 25 миллионов раз.

♥ Общий вес бактерий, живущих в организме человека, составляет 2 килограмма.

♥ В головном мозге человека за одну секунду происходит 100.000 химических реакций.

♥ С момента рождения в мозгу человека уже существует 14 миллиардов клеток, и число это до самой смерти не увеличивается. Напротив, после 25 лет оно сокращается на 100 тысяч в день. За минуту, потраченную вами на чтение, умирает около 70 клеток. После 40 лет деградация мозга резко ускоряется.

Прозвішча падпісчыка

# Ці дачакаецца Любоў Мікалаеўна?

Любоў Мікалаеўна Пынцікава працуе малаказборшчыкам. Для працы ёй патрабуецца самае неабходнае -- конь і калёсы для перавозкі малочных фляг. З цягам часу, як вядома, любая тэхніка мае схільнасць да таго, каб псавацца і выходзіць са строю. Дзесьці ў ліпені бягучага года так і здарылася з тымі калёсамі для малочнай перавозкі. Паколькі гэта маёмасць аграфірмы "Днепр", а малако збіраецца на тэрыторыі Брылеўскага сельсавета, то Любоў Мікалаеўна звярнулася са сваёй бядой да старшыні выканкама Савета Уладзіміра Ільіча Мажорава. Той прапанаваў з'ездзіць да галоўнага заатэхніка фірмы "Днепр" Валянціна Іванавіча Лапшынова і разам з ім абмеркаваць шляхі вырашэння ўзніклай праблемы. Так і зрабілі: сустрэліся усе разам і вырашылі даручыць рамонт Мікалаю Сяргеевічу Уханаву. А фірма "Днепр" паабяцала за працу заплаціць адпаведныя грошы.

*Любоў Пынцікава і калёсы, якім патрабуецца рамонт*

Работа закіпела, і праз пэўны час калёсы сталі як новыя. Але абяцаныя грошы ніхто так і не даў. А раз так, то М. Уханаў адмовіўся аддаваць адрамантаваную рэч -- да поўнага фінансавага разліку. А тут паламаліся і другія калёсы, на якіх працавала Л.Пынцікава і якія таксама належаць фірме. А паколькі не было разліку за першы рамонт, то да М.Уханава ўжо не пайшлі. І прыйшлося Любові Мікалаеўне перасаджвацца на вазок, які належыць асабіста ёй, -- працаваць жа трэба.

Звароты да начальства нічога не далі -- ніякіх грошай за рэмонт ніхто не дае. Л. Пынцікава звярнулася нават непасрэдна да генеральнага дырэктара УКАП "Фірма "Днепр" Уладзіміра Віктаравіча Давыдава,-- той уважліва выслухаў і паабяцаў заплаціць неабходныя грошы. Але, як кажуць, *"воз и ныне там"...*

Ёсць яшчэ адзін бок гэтай дзіўнай гісторыі -- конь, які цягае кожную раніцу калёсы з малаком. Ён жыве на падворку Л. Пынцікавай і, як любая жывая істота, патрабуе ежы і адпаведнага дагляду. А паколькі гэтая жывёліна таксама з'яўляецца маёмасцю аграфірмы, то Любоў Мікалаеўна зноў - такі звярнулася да В.Лапшынова: дапамажыце! Валянцін Іванавіч цвёрда паабяцаў: як толькі пачнуць вазіць, то на каня дадуць пяць рулонаў саломы і тры рулона сена. І як вы думаеце, ці спраўдзілася чарговая абяцанка? Правільна: ніякай саломы і сена коньпрацаўнік ад роднай фірмы не атрымаў.

І што далей? Куды і да каго звяртацца, каб вырашыць гэтыя, не вельмі складаныя пытанні? Ці дачакаецца Любоў Мікалаеўна Пынцікава нейкай справядлівасці?..

***Мікола ЯЦКОЎ.***

# Новы выгляд

**Дарожныя службы нашага раёна ў сваёй працы імкнуцца трымаць высокую планку. Нядаўна быў амаль капітальна адрамантаваны аўтобусны прыпынак ля вёскі Каменка -- з'явіліся новыя бардзюры, паклаўся свежы асфальт, а на перафарбаваным будынку зазіхацела новая прыгожая шыльда з назвай. І гэта добра! А вось каб у дадатак да ўсяго тут з'явілася б шыльда з раскладам руху аўтобусаў, то гэта было б наогул цудоўна.**

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© "Брылеўскі летапіс", 2008

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ